## БІБЛІЯГРАФІЯ


1. Маркаў Фёдар Рыгоравіч // Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Астравецкага раёна.— Мн.:БелЭн., 2004. –с. 264
2. Маркаў Фёдар Рыгоравіч // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941-1945: Энцыкл.— Мн.: БелСЭ, 1990.—680с.: іл. –с.330
3. «Маркаўцы”: [Атрад Маркава] // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Астравецкага раёна. – Мн.:БелЭн., 2004. –с.267
4. Марков Фёдор Григорьевич // Их именами названы…: Энцикл. Справочник.—Мн.: БелСЭ, 1987. —711.:ил.—с.402
5. Рыбік Алёна. Наш партызан // Астравецкая праўда.– 2005.—7 мая
6. Чечет В. Патриотическое воспитание в семье.—Мн.: Нар. Асвета, 1989. –с. 127


**Званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена Ф.Р.Маркаву 1 студзеня 1944 года**


Адрас г. Астравец
пр-т Энергетыкаў, 2

Тэлефон: 8-015-91-79-2-90
Эл. почта: ostrov_bibl@mail.ru



Складанне і камп'ютэрны набор: Г.І.Францкевіч
Адказны за выпуск: В.М.Тварагаль


Аддзел маркетынгу
і сацыякультурнай
дзейнасці

*Серыя "Іх імёнамі названы вуліцы Астраўца"*

# МАРКАЎ



# Фёдар Рыгоравіч

Астравец
2022

# Фёдар Рыгоравіч Маркаў — камандзір партызанскага атрада

## (24.12.1913—14.1.1958)

***Маркаў Фёдар Рыгоравіч***

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Вілейскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну. Герой Савецкага Саюза (1.1.1944 г.). Нарадзіўся 24.12.1913 г. ў в. Каланішкіс Швянчонскага раёна Літвы ў сялянскай сям'і. У 1948 г. скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП(б). Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. За рэвалюцыйную дзейнасць у 1936 — 39 гг. быў зняволены ў канцлагер у Бярозе-Картузскай, у Віленскай турме Лукішкі. Пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР у 1939 — 41 гг. старшыня Свенцянскага гарсавета, намеснік старшыні Вілейскага аблвыканкома. 3 верасня 1941 г. у партызанах: камандзір спецгрупы, з мая 1942 г. — партызанскага атрада імя А.В.Суворава, з лістапада 1942 г. — партызанскай брыгады імя К.Я.Варашылава. Адначасова з красавіка 1943 г. начальнік ваенна -аператыўнага аддзела Вілейскага падпольнага абкома КП(б)Б. З 1944 г. працаваў намеснікам старшыні Вілейскага і Маладзечанскага аблвыканкомаў. З 1940 г. дэпутат Вярхоўнага Савета БССР.

Памёр 14.1.1958 г. Пахаваны ў г. Маладзечна, дзе яму пастаўлены помнік. Яго імем названы вуліца і парк у г. Маладзечна, вуліцы ў гарадах Вілейка, Мядзел, Паставы, гар. пасёлках Астравец, Лынтупы (Пастаўскі раён).

***«Маркаўцы»***

Атрад Маркава быў створаны з груп С.А.Пронькі, Саўлевіча і ягонай (пастаўскай і лынтупскай). У жніўні 1942 г. адбылася першая, а крыху пазней — другая сустрэча. На момант аб'яднання ў Маркава было 13 чалавек, у Пронькі — 8.

26 лістапада 1942 г. Маркаў выдаў загад аб стварэнні партызанскай брыгады. У яе склад увайшлі атрады імя Суворава (былы атрад Маркава) і «Знішчальнік». Аб'яднанне атрадаў не парушала і не абмя-жоўва.та іх самастойнасці. Камандаванне кожнага атрада само вырашала характар баявой дзейнасці. Брыгада увесь час расла, і да 1944 года ў ёй ужо налічвалася 12 атрадаў.

Адразу пасля стварэння брыгады пачалося будаўніцтва зямлянак у Нарачанскім лесе. 15 снежня часткі атрадаў імя Суворава і «Знішчальнік» пад кіраўніцтвам Маркава адправіліся на захад ад базы, і праз два дні адбыўся бой з камайскай паліцыяй, у выніку якога было забіта 14 паліцэйскіх, у тым ліку і камендант. Праз чатыры дні гэтая ж група вяла начны бой у Лынтупах. Былі спалены пошта, валаснoе і паліцэйскае ўпраўленні. Партызаны забілі і паранілі дзевяць паліцэйскіх.

13 студзеня 1943 г. на базу прыбыла брыгада Шляхтунова з Усходняй Беларусі. Яму таксама было даручана дзейнічаць на тэрыторыі Вілейскай вобласці. Паміж Маркавым і Шляхтуновым адбыліся перагаворы, у выніку якіх было прынята рашэнне аб'яднаць брыгады ў адну і прысвоіць ёй імя Варашылава. Шляхтуноў стаў камандзірам, а Маркаў — камісарам брыгады. Аб'яднанне насіла фармальны характар. Партызаны атрадаў імя Суворава, «Знішчальнік», імя Чапаева называлі сябе маркаўцамі, а прыбыўшых — шляхтуноўцамі...

17 студзеня 1943 г. карны атрад немцаў у складзе 300 чалавек прыбыў у вёску Макрыцы. Немцам стала вядома, што жыхары вёскі Калодзіна дапамагаюць партызанам. Карнікі намерваліся спаліць вёску і разграміць партызанскі атрад імя Суворава, які дыслацыраваўся ў лесе паблізу хутара Гаць.Вечарам таго ж дня насустрач немцам была выслана 1-я рота атрада імя Суворава на чале з яе камандзірам Аляксандрам Малафеевым і палітруком Васілём Пелюхавым. Рота залягла ля дарогі паміж вёскамі Макрыцы і Калодзіна. У 10 гадзін раніцы на дарозе нечакана з'явіліся фашысты. Партызаны ўступілі ў няроўны бой. Немцы адкрылі ўраганны агонь, але партызаны вырашылі не адступаць і трапным прыцэльным агнем знішчалі ворагаў. Аднак сілы былі няроўныя. Немцы пачалі акружаць смельчакоў. Гібель партызан здавалася непазбежнай. І тут пачулася дружнае: «Ура!» Гэта атрад імя Суворава пад камандаваннем камбрыга Ф.Р.Маркава кінуўся ў атаку. Наступленне карнікаў было адбіта і яны паспешліва адступалі, пакінуўшы на полі бою 26 чалавек забітымі, вялікую колькасць зброі і боепрыпасаў...

*І.М.Мартынаў.*

